(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
"ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ
ІМЯ КАНДРАТА КРАПІВЫ"

УДК: 745(476)+391.1/.3+792.024(476)

**ГАЙДУКОВА**
**Юлія Аляксандраўна**

# СЦЭНІЧНАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА КАСЦЮМА (ДРУГАЯ ПАЛОВА XX – ПАЧАТАК XXI СТАГОДДЗЯ)

Аўтарэферат дысертацыі
на саісканне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства

па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і
дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура

Мінск 2010

Работа выканана на кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў
УА "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў"

| | |
|---|---|
| **Навуковы кіраўнік:** | **Барвенава Ганна Аляксандраўна,**<br>кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт,<br>дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят<br>УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт<br>культуры і мастацтваў" |
| **Афіцыйныя апаненты:** | **Сахута Яўген Міхайлавіч,**<br>доктар мастацтвазнаўства, прафесар,<br>вядучы навуковы супрацоўнік аддзела<br>выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога<br>мастацтва ДНУ "Інстытут<br>мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору<br>імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі<br>навук Беларусі"<br><br>**Коўрык Аксана Аляксандраўна,**<br>кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт,<br>дацэнт кафедры дызайну<br>Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта |
| **Апаніруючая арганізацыя:** | ДУ "Нацыянальны мастацкі музей<br>Рэспублікі Беларусь" |

Абарона адбудзецца 3 снежня 2010 года ў 16.00 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.02 у ДНУ "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі" па адрасе: 220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2, пакой № 302. E-mail: secr@bas-net.by. Тэл. вучонага сакратара (017) 284-16-80.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ДНУ "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі" (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2)

Аўтарэферат разасланы "29" кастрычніка 2010 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт Н. А. Юўчанка

# КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

Сцэнічны касцюм, створаны на аснове народнага, з'яўляецца ўнікальнай формай дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, сродкам захавання і развіцця традыцый беларускага народнага касцюма, выконвае важную культурна-асветніцкую функцыю папулярызацыі нацыянальнай культуры сярод суайчыннікаў, спрыяе ўтварэнню самабытнага вобраза Беларусі па-за межамі краіны. Створаны на аснове традыцыйнага адзення сцэнічны касцюм яднае мастацкае мінулае з сучаснасцю. У адрозненне ад музейных экспанатаў, якія фіксуюць гісторыю, сцэнічныя касцюмы – гэта форма працягу існавання народнай традыцыі, па сутнасці, адзіная "жывая" форма развіцця народнага касцюма, як аднаго з сімвалаў нацыянальнай ідэнтычнасці і красамоўнай ілюстрацыі эстэтычных ідэалаў, заснаваных на традыцыйным светаўспрыманні. Сцэнічнае ўвасабленне народнага касцюма яскрава ілюструе развіццё нацыянальнай мастацкай культуры, мае вялікае значэнне для сучаснага мастацтвазнаўства і патрабуе навуковага даследавання і абгрунтавання працэсаў, якія ляжаць у аснове мастацкай трансфармацыі традыцыйнага адзення ў сцэнічны касцюм.

Нягледзячы на тое, што дасягненняў у галіне сцэнічнага касцюма, створанага на аснове народнага, у другой палове XX – пачатку XXI ст. нямала, а яго праектаванне ўваходзіць у праграму навучання студэнтаў на кафедрах мадэлявання адзення вядучых вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь, маштабнага даследавання сцэнічнага касцюма, створанага на аснове народнага, да гэтага часу не існуе. Дадзенае дысертацыйнае даследаванне абагульняе мастацкую спадчыну ў галіне стварэння беларускага сцэнічнага касцюма, праводзіцца яго сістэматызацыя, перыядызацыя і класіфікацыя. Новыя матэрыялы, якія ўводзяцца ў навуковы ўжытак, і вынікі дысертацыі паглыбляюць і пашыраюць уяўленні пра нацыянальнае мастацтва, будуць садзейнічаюць даследчыкам у далейшым навуковым аналізе праблематыкі беларускага сцэнічнага касцюма.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі**

Даследаванне сцэнічнага ўвасаблення беларускага народнага касцюма па сваёй тэматыцы адпавядае прыярытэтнаму накірунку мастацтвазнаўства. Тэма дысертацыі з'яўляецца планавым навуковым даследаваннем кафедры тэорыі і гісторыі мастацтва УА "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў". Дадзеная праца звязана з Дзяржаўнай комплекснай праграмай навуковых даследаванняў "Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры" ("Гісторыя і культура") на 2006 – 2010 гг., зацверджанай пастановай Прэзідыума НАН Беларусі ад 24.02.2006 г. № 20, якая распра-

цоўваецца ДНУ "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі".

**Мэты і задачы даследавання**

Мэта даследавання – стварэнне сістэмных уяўленняў пра беларускі сцэнічны касцюм, які быў створаны на аснове народнага ў другой палове XX – пачатку XXI ст. і адначасова з'яўляецца часткай комплексу традыцыйнай культуры і аўтарскім творам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У адпаведнасці з пастаўленай мэтай ставіцца шэраг задач:

- прасачыць мастацкую трансфармацыю традыцыйнага беларускага адзення пры стварэнні сцэнічных касцюмаў;
- удакладніць сістэму прынцыпаў сцэнічнай інтэрпрэтацыі і класіфікаваць сцэнічныя касцюмы, якія былі створаны на аснове беларускага народнага адзення, паводле метадаў сцэнічнай інтэрпрэтацыі (копія, рэплікацыя, рэтраспекцыя, рэмінісцэнцыя, імправізацыя);
- вызначыць перыяды развіцця беларускага сцэнічнага касцюма, створанага на аснове народнага, і прасачыць эвалюцыю сцэнічнага ўвасаблення беларускага народнага адзення ў другой палове XX – пачатку XXI ст.;
- выявіць мастацка-стылістычныя асаблівасці беларускага сцэнічнага касцюма, створанага на аснове народнага ў другой палове XX – пачатку XXI ст.;
- акрэсліць асаблівасці выкарыстання мастакамі-мадэльерамі Беларусі метадаў інтэрпрэтацыі народнага касцюма пры стварэнні сцэнічных касцюмаў у другой палове XX – пачатку XXI ст.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

*Аб'ектам* даследавання з'яўляецца сцэнічны касцюм, распрацаваны беларускімі мастакамі-мадэльерамі на аснове народнага ў другой палове XX – пачатку XXI ст.

*Прадметам* даследавання з'яўляецца сцэнічнае ўвасабленне беларускага народнага касцюма.

Выбар аб'екта і прадмета абгрунтоўваецца неабходнасцю стварэння цэласнай сістэмнай карціны сцэнічнага ўвасаблення беларускага народнага касцюма, што важна не толькі для тэорыі ў галіне гісторыі беларускага мастацтва, але і для профільнай адукацыі і творчасці мастакоў-мадэльераў.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону**

1. Мастацкая трансфармацыя традыцыйнага беларускага адзення пры стварэнні сцэнічных касцюмаў адбываецца шляхам інтэрпрэтацыі, творчага пераасэнсавання, заснаванага на асацыятыўным мысленні мастака, якое забяспечвае індывідуальны падыход да разумення і трактоўкі першакрыніцы. Трансфармацыя форм традыцыйнага касцюма і яго адаптацыя да сучаснага ўрбаністычнага асяроддзя адбываецца як шляхам стварэння сцэнічных варыяцый традыцыйных форм на-

цыянальнага касцюма (копія, рэплікацыя), так і ў выніку значнага пераасэнсавання народных традыцый у арыгінальных працах мастака-мадэльера (імправізацыя).

2. Класіфікацыя сцэнічных касцюмаў праводзіцца паводле ступені аддаленасці ад першакрыніцы – беларускага народнага адзення, а таксама ступені дамінавання фармальнай і вобразнай сістэмы народнага касцюма над аўтарскім стылем або наадварот. Усе сцэнічныя касцюмы, створаныя на аснове народнага, падзяляюцца на групы паводле прынцыпаў сцэнічнай інтэрпрэтацыі: этнатрадыцыйныя, этнастылізаваныя і этнамадэрнісцкія. Кожная група мае свой падзел паводле метадаў, якія выкарыстоўваюць мастакі-мадэльеры: этнатрадыцыйныя – копія і рэплікацыя, этнастылізаваныя – рэтраспекцыя і рэмінісцэнцыя, этнамадэрнісцкія – імправізацыя.

3. У другой палове XX ст. вылучаюцца наступныя перыяды развіцця беларускага сцэнічнага касцюма, створанага на аснове народнага: першы – канец 1950-х – 1970-я гг.; другі – 1980-я – першая палова 1990-х гг.; трэці – другая палова 1990-х – 2000-я гг. Кожны з перыядаў вызначаецца пэўнымі асаблівасцямі прыярытэтных накірункаў развіцця культуры і мастацтва Беларусі, адрозненнямі ў сістэме падрыхтоўкі мастакоў-мадэльераў, магчымасцямі іх творчай рэалізацыі, узроўнем развіцця вытворчасці сцэнічных касцюмаў.

4. Сцэнічны касцюм канца 1950 – 1970-х гг. характарызуецца наступнымі асноўнымі мастацка-стылістычнымі асаблівасцямі: імкненнем да абагульненасці вобраза, лаканічнымі формамі і канструкцыямі, дамінаваннем дэкору і пераважным выкарыстаннем графічнай бела-чырвонай гамы. Адметнасцю сцэнічнага касцюма 1980 – пачатку 1990-х гг. з'яўляюцца наступныя ўласцівасці: дамінаванне формы над аздабленнем, шматслойнасць і асіметрыя крою, імкненне да маляўнічай каларыстыкі, разнастайнасць і прапрацаванасць арнаментальных матываў. Сцэнічны касцюм канца 1990 – 2000-х гг. вылучаецца шырокім выкарыстаннем сучасных тканін і спосабаў аздобы, неўласцівых беларускаму народнаму адзенню, выкарыстаннем здабыткаў жывапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а таксама запазычаннем асобных элементамі касцюма іншых народаў.

5. У канцы 1950-х – 1970-я гг. у пошуку абагульненага вобраза народнага касцюма мастакі-мадэльеры Беларусі стваралі сцэнічныя стылізацыі касцюмаў па матывах традыцыйных строяў, але аддаленыя ад крыніцы інспірацыі. У 1980 – пачатку 1990-х гг. пры выкарыстанні метадаў рэтраспекцыі і рэмінісцэнцыі асновай касцюма была першакрыніца, якая дакладна пазнавалася. У канцы 1990-х – 2000-я гг. найбольш дынамічным у развіцці метадам з'яўляецца імправізацыя, якая вызначаецца высокай ступенню

аддаленасці ад беларускага народнага касцюма і выкарыстаннем нетрадыцыйных крыніц інспірацыі.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Прапанаваная праца – першае ў беларускім мастацтвазнаўстве комплекснае даследаванне сцэнічнага касцюма, створанага на аснове народнага, у якім выяўлены дасягненні і праблемы сцэнічнага ўвасаблення беларускага народнага адзення. На аснове ўсебаковага падыходу да вывучэння сцэнічнага касцюма беларускіх калектываў прасочана мастацкая трансфармацыя традыцыйнага беларускага адзення пры стварэнні сцэнічных касцюмаў, удакладнена сістэма прынцыпаў сцэнічнай інтэрпрэтацыі і праведзена класіфікацыя сцэнічнага касцюма паводле метаду, які выкарыстоўваецца мастаком-мадэльерам (копія, рэплікацыя, рэтраспекцыя, рэмінісцэнцыя, імправізацыя). У працы ўпершыню вызначаны гістарычныя этапы развіцця беларускага сцэнічнага касцюма і дадзена характарыстыка кожнаму з этапаў, вызначаны мастацка-стылістычныя асаблівасці беларускага сцэнічнага касцюма, створанага на аснове народнага, і акрэслены асаблівасці выкарыстання метадаў інтэрпрэтацыі мастакамі-мадэльерамі Беларусі пры стварэнні сцэнічных касцюмаў у другой палове XX – пачатку XXI ст.

Дысертацыя з'яўляецца самастойным навуковым даследаваннем, праведзеным пад кіраўніцтвам кандыдата мастацтвазнаўства, дацэнта Г. А. Барвенавай у аспірантуры УА "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў". Значная частка выкарыстаных матэрыялаў раней не публікавалася і ўводзіцца ў навуковы ўжытак упершыню. Вынікі даследавання маюць навуковую значнасць для асэнсавання, вывучэння і далейшай распрацоўкі актуальных праблем сучаснага мастацтвазнаўства, практычную – для профільнай адукацыі і творчасці мастакоў-мадэльераў.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні дысертацыі былі выкладзены аўтарам у дакладах на 10 міжнародных канферэнцыях: на II-й міжнар. навук.-творч. канф. "Няфёдаўскія чытанні" (БДАМ, Мінск, 24–25 красав. 2005 г.); на II-й міжнар. навук.-практ. канф. "Творчасць. Філасофія. Мастацтва" (БДАМ, Мінск, 11–12 красав. 2006 г.); на IX-й міжнар. навук. канф. "Мода и Дизайн: исторический опыт – новые технологии" (СПб гос. ун-т технологии и дизайна, Российский этнографический музей, СПб, 4–7 июля 2006 г.); на міжнар. навук.-тэар. канф. "Актуальные проблемы искусства и современной художественной школы Белоруссии в условиях глобализации культуры" (БГАИ, Минск, 19 окт. 2006 г.); на міжнар. канф., прысв. 50-годдзю ІМЭФ імя К. Крапівы "Мастацтва, фальклор, этнічныя традыцыі ў выяўленні актуальных задач сучаснай культуры" (НАН Беларусі, Ін-т мастацт-

вазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Мінск, 7–8 чэрв. 2007 г.); на IV-й міжнар. навук.-творч. канф. "Няфёдаўскія чытанні" (БДАМ, Мінск, 19 сак. 2009 г.); на VII-й міжнар. навук.-практ. канф. "Наука и образование в условиях социально-экономической трансформации общества" (Ин-т современных знаний им. А. М. Широкова, Минск, 18 мая 2009 г.); на VIII-й міжнар. навук.-практ. канф. "Наука и образование в условиях социально-экономической трансформации общества" (Ин-т современных знаний им. А. М. Широкова, Минск, 15 апр. 2010 г.); на міжнар. навук. канф. "Актуальныя праблемы міравой мастацкай культуры" памяці прафесара У. Д. Разенфельда. Гродзенскі дзярж. ун-т імя Я. Купалы, Гродна, 25–26 красав. 2010 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Па тэме дысертацыі аўтарам апублікаваны 13 артыкулаў, з іх – 5 артыкулаў у рэцэнзаваных навуковых часопісах (аб'ёмам 1,73 друкаваных аркуша), 1 артыкул – у зборніку навуковых выданняў, 1 артыкул – у навуковым вучэбна-метадычным дапаможніку і 6 матэрыялаў навуковых канферэнцый (аб'ёмам 2.56 друкаваных аркуша). Агульны аб'ём апублікаваных прац – 4,3 друкаваных аркуша.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Структура дысертацыі абумоўлена логікай выкладання матэрыялу і складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, асноўнай часткі, якая складаецца з дзвюх глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса і двух дадаткаў.

Агульны аб'ём дысертацыі – 216 старонак, з іх 99 старонак займае асноўны тэкст, 16 старонак – бібліяграфічны спіс, які складаецца са спіса выкарыстаных крыніц (203 найменні на беларускай, рускай, польскай, нямецкай і англійскай мовах) і спіса публікацый аўтара (13 найменняў). Дадаткі займаюць 99 старонак. Альбом ілюстрацый уключае 315 адзінак ілюстрацыйнага матэрыялу.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

1. Беларускі сцэнічны касцюм, створаны на аснове народнага – гэта важная і знакавая з'ява ў мастацтве нашай краіны, твор дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Мастацкая трансфармацыя беларускага народнага адзення для сцэны адбываецца шляхам інтэрпрэтацыі, пераасэнсавання, перайначвання аб'екта – творчых працэсаў, заснаваных на асацыятыўным мысленні мастака-мадэльера. Мастацкія асацыяцыі забяспечваюць творчае пераасэнсаванне гістарычнай спадчыны, індывідуальны падыход аўтара да разумення і трактоўкі першакрыніцы. Таму ў трансфармацыі беларускага народнага касцюма ў сцэнічных мэтах ступень аўтарскага ўдзелу ў працэсе стылізацыі з'яўляецца значным фактарам: або дамінаванне фармальнай і вобразнай сістэмы народнага касцюма над аўтарскім стылем, або наадварот. Функцыянальнае прызначэнне традыцыйнага і сцэнічнага касцюма адрозніваецца: у сцэнічным касцюме ўтылітарныя якасці саступаюць месца мастацкім, мэтай сімвалічнай сістэмы сцэнічнага касцюма з'яўляецца перадача інфармацыі ад мастака-мадэльера да гледача. Мастацкая выразнасць дасягаецца за кошт кампазіцыйнага вырашэння. Кампазіцыя касцюма мае пэўныя ўласцівасці, пры стварэнні кампазіцыі аўтар карыстаецца вялікім арсеналам сродкаў для дасягнення фармальных і вобразных мэтаў. Важным крытэрыем ацэнкі сцэнічных касцюмаў з'яўляецца цэласнасць касцюмнай групы, якая прадугледжвае ўзаемасувязь паміж сродкамі і прыёмамі кампазіцыі ўсіх касцюмаў, якія знаходзяцца на сцэне адначасова. Адпаведнасць сцэнічнага дзеяння і яго вонкавага аздаблення ўключае ў сябе праблемы стылістыкі, гарманічнага дапасавання рухаў, гукаў і візуальных сродкаў – святла, касцюмаў, дэкарацый. Акрамя дапасавання касцюма да задумы аўтараў сцэнічнай дзеі, паўстае пытанне ўспрымання мастацкага твора гледачом [1; 4; 6; 11; 13].

2. Сістэма прыцыпаў сцэнічнай інтэрпрэтацыі народнага адзення будуецца паводле ступені аддаленасці сцэнічнага касцюма ад першакрыніцы. Наступныя тэрміны адлюстроўваюць заканамернасць гэтых суадносінаў і размеркаваны ў парадку ўзрастання аўтарскай стылістыкі ў сцэнічнай інтэрпрэтацыі традыцыйнага касцюма: копія, рэплікацыя, рэтраспекцыя, рэмінісцэнцыя, імправізацыя. Сцэнічныя касцюмы, якія створаны на аснове народнага, можна падзяліць на тры вялікія групы, якія адпаведна характарызуюць прынцыпы інтэрпрэтацыі: этнатрадыцыяналізм, этнастылізацыя, этнамадэрнізм, а таксама ілюструюць рознасць падыходаў, ступень выкарыстання і аўтарскай перапрацоўкі першакрыніцы – нацыянальнага касцюма. Касцюмы, створаныя пры дапамозе метадаў капіяван-

ня і рэплікацыі, аб'ядноўваюцца ў групу пад назвай этнатрадыцыйныя. Для касцюмаў гэтай групы характэрны паслядоўная пераемнасць камплектацыі, канструкцый, колеравых спалучэнняў, дэкору і матэрыялаў, выкарыстанне традыцыйных тэхналогій выканання беларускага народнага адзення (візуальны вобраз ансамбляў "Неруш", "Госціца", "Талака"). Касцюмы, у аснову праектавання якіх пакладзены метады рэтраспэкцыі і рэмінісцэнцыі, складаюць самую вялікую групу і аб'ядноўваюцца пад назвай этнастылізаваныя. Касцюмы гэтай групы характарызуюцца мастацкай перапрацоўкай форм і канструкцый народнага адзення; адвольнай трактоўкай колеравай гамы, выкарыстаннем сучасных матэрыялаў і спосабаў аздаблення. Пераважная большасць калектываў Беларусі "апранута" ў падобныя стылізаваныя касцюмы, сярод іх – Дзяржаўны ансамбль танца Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны заслужаны харэаграфічны ансамбль "Харошкі", Дзяржаўны народны акадэмічны хор імя Г. І. Цітовіча, Дзяржаўная харавая капэла імя Р. Шырмы, ансамблі "Свята", "Купалінка", "Бяседа" і інш. Трэцюю групу складаюць этнамадэрнісцкія касцюмы, створаныя з выкарыстаннем мэтаду імправізацыі. Касцюмы гэтай групы з'яўляюцца самастойным творам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, які толькі асацыятыўна звязаны з беларускай традыцыйнай культурай. Формы касцюмаў – аўтарскія, колеравая гама – адвольная і падкрэслена вобразная, матэрыялы і дэкор – адвольныя. Касцюмы гэтай групы выкарыстоўваюцца эстраднымі калектывамі, творчасць якіх заснавана на мастацкай перапрацоўцы і пераасэнсаванні культурнай спадчыны Беларусі ("Песняры", "Сябры" і інш.) [3; 5; 6; 11; 12; 13].

3. Беларускі сцэнічны касцюм, створаны на аснове народнага прайшоў тры перыяды развіцця: першы – канец 1950-х – 1970-я гг., другі – 1980-я – пачатак 1990-х гг., трэці – канец 1990-х – 2000-я гг. Пачаткам стварэння прафесійнага сцэнічнага касцюма, у аснову якога пакладзены народны, можна лічыць канец 1950-х гг. – час, калі традыцыйны касцюм паступова выходзіць з ужытку, а яго выкарыстанне на сцэне і праектаванне ўласна сцэнічнага касцюма пераходзіць у сферу прафесійнай мастацкай творчасці і мастацкіх промыслаў. Наступны перыяд у развіцці сцэнічнага касцюма Беларусі, які наступіў у 1980 – пачатку 1990-х гг., звязаны са станаўленнем нацыянальнай школы мадэлявання, прыходам у сферу праектавання сцэнічных касцюмаў немалой колькасці прафесійных мастакоў-мадэльераў, уздымам цікаўнасці грамадства да захавання нацыянальна-гістарычнай спадчыны, з'яўленнем новых вакальна-інструментальных і харэаграфічных калектываў. З другой паловы 1990-х гг. палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя змены, пашырэнне культурнай і інфармацыйнай прасторы прывялі да зменаў у праектаванні сцэнічных касцюмаў для эстрадных калектываў [2; 3; 5; 10].

4. Сцэнічны касцюм канца 1950 – 1970-х гг. вызначаецца наступнымі мастацка-стылістычнымі асаблівасцямі: аднатыпныя строі для ўсіх удзельнікаў ансамбля; стылізацыя форм і канструкцый адзення ў адпаведнасці з моднымі тэндэнцыямі таго часу; выкарыстанне графічнай белачырвонай гамы (зрэдку з дадаткам чорнага колеру); дамінаванне дэкору, які складаўся з асобных элементаў традыцыйнага арнаменту, павялічаны рапарт арнаментальных матываў; адсутнасць аксесуараў (акрамя галаўных убораў). Вобразная аснова сцэнічнага касцюма гэтага перыяду імкнецца да абагульненасці, эпічнасці, манументальнасці. У сцэнічных касцюмах 1980 – пачатку 1990-х гг. вылучаюцца наступныя мастацка-стылістычныя асаблівасці: індывідуалізацыя касцюма для ўдзельнікаў ансамбля; выкарыстанне разнастайных форм і канструкцый адзення; дамінаванне формы над дэкорам, шматслойнасць і асіметрыя сілуэтаў, дэталізацыя касцюма; імкненне да маляўнічага каларыту з наяўнасцю тонкіх суадносін колераў і складаных адценняў; разнастайнасць і прапрацаванасць арнаментальных матываў; шматварыянтнасць камплектацыі аксесуараў. Сцэнічным касцюмам 1980 – пачатку 1990-х гг. уласціва вобразная разнастайнасць і непаўторны аўтарскі стыль мастака-мадэльера. Сцэнічным касцюмам канца 1990 – 2000-х гг. характэрны: выкарыстанне ў якасці крыніцы інспірацыі не толькі традыцыйнага адзення але і здабыткаў беларускай мастацкай культуры ў шырокім сэнсе; запазычанне кампанентаў адзення і спосабаў аздобы касцюма іншых народаў; адвольная аўтарская гульня з формамі, каларытам і дэкорам касцюма; шырокае выкарыстанне сучасных тканін і спосабаў аздаблення, неўласцівых беларускаму народнаму адзенню; імкненне да гіпербалізаванай сцэнічнай выразнасці [1; 2; 5; 7; 8; 9; 10].

5. У канцы 1950-х – 1970-я гг. сцэнічны касцюм большасці мастацкіх калектываў ствараўся на аснове абагульненых рысаў традыцыйнага беларускага адзення, характарызаваўся аддаленасцю ад крыніцы інспірацыі і можа быць вызначаны як касцюм, створаны "па матывах народнага". Станаўленне беларускага прафесійнага сцэнічнага касцюма звязана з імёнамі Л. Баразны і М. Раманюка, якія былі мастакамі-этнографамі і выкарыстоўвалі метад капіявання з улікам рэгіянальных асаблівасцей беларускага адзення. У гэты перыяд метад імправізацыі можна назіраць толькі эпізадычна, напрыклад, у працах В. Бартлавай і Г. Крываблоцкай. У 1980 – пачатку 1990-х гг. у сцэнічным увасабленні народных строяў з'яўляецца інавацыйная тэндэнцыя, звязаная з павелічэннем аўтарскай ролі мастакоў-мадэльераў. Непаўторны аўтарскі стыль выразна пазнаецца ў творах А. Александровіч, Ю. Піскуна, І. і У. Булгакавых, Г. Юрэвіч, Т. Чарнышовай, В. Дзёмкінай, Н. Моніч і інш. У гэты перыяд асноўнымі метадамі стварэння сцэнічнага касцюма былі рэтраспекцыя і рэмінісцэн-

цыя, у якасці характэрнай рысы такіх твораў можна вызначыць прысутнасць у аснове сцэнічнага касцюма дакладна ідэнтыфікаванай першакрыніцы. У канцы 1990-х – 2000-я гг. у стварэнні сцэнічнага касцюма на аснове народнага найбольш дынамічна развіваецца метад імправізацыі. У гэтым накірунку працуюць Ж. Капуснікава, Т. Карака, Г. Балаш, Е. Міскевіч, і інш. Касцюмы, створаныя з выкарыстаннем метаду імправізацыі, маюць высокую ступень аддаленасці ад першакрыніцы, што пры няўважлівых адносінах да нацыянальнай культуры і адсутнасці ў мастака-мадэльера творчага густу і прафесіяналізму прыводзіць да стварэння безгустоўных і лапезных сцэнічных касцюмаў [1; 2; 4; 7; 8; 9].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Матэрыялы і вынікі дысертацыйнага даследавання ўведзены ў шэраг навучальных дысцыплін напрамку спецыяльнасці "Дызайн касцюма і тканін": "Мастацкае праектаванне касцюма", "Гісторыя касцюма і моды", "Гісторыя спецыяльнасці", "Гісторыя дызайна", "Асновы кампазіцыі касцюма", "Праца ў матэрыяле", "Праектная графіка" [акты аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 08.02.2010, 05.03.2010 і 26.03.2010].

Матэрыялы даследавання з'яўляюцца карысным дапаўненнем метадычнай базы, запатрабаваны ў выставачнай і асветніцкай дзейнасці музеяў, галерэй і навукова-метадычных цэнтраў Беларусі (праведзена ўдакладненне музейных пашпартоў, дапоўнены метадычныя дапаможнікі, састаўлены анатацыі, экскурсійныя і лекцыйныя тэксты) [акты аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 20.01.2010, 15.02.2010].

Вынікі даследавання маюць навуковую значнасць для стварэння наступных тэарэтычных прац па гісторыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і гісторыі беларускага касцюма. Прапанаваны падыход да аналізу сцэнічнага касцюма, як цэласнай сістэмы, якая адначасова з'яўляецца часткай комплексу традыцыйнай культуры і аўтарскім творам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, можа быць выкарыстаны пры даследаванні іншых твораў мастацтва: тэатральнага касцюма, адзення, створанага дызайнерамі ў фальклорным стылі, і інш. Мастакі-мадэльеры і мастацкія кіраўнікі фальклорных ансамбляў пры стварэнні гарманічнага візуальнага сцэнічнага аблічча беларускіх калектываў могуць абапірацца на тэкставыя і візуальныя матэрыялы даследавання.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ


**Публікацыі ў рэцэнзаваных навуковых часопісах і зборніках**

1. Гайдукова, Ю. А. Касцюмы "Песняроў" як адлюстраванне нацыянальнага вобраза беларуса / Ю. А. Гайдукова // Роднае слова. – 2009. – № 11. – С. 105–107.

2. Гайдукова, Ю. А. Песня пра долю: з гісторыі сцэнічнага касцюма ансамбля "Песняры" / Ю. А. Гайдукова // Роднае слова. – 2009. – № 4. – С. 105–107.

3. Гайдукова, Ю. А. Сучасныя метады сцэнічнай інтэрпрэтацыі беларускага народнага касцюма / Ю. А. Гайдукова // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2010. – № 3. – С. 82–86.

4. Гайдукова, Ю. А. Эволюция методов сценической интерпретации белорусского народного костюма / Ю. А. Гайдукова // Вести института современных знаний. – 2009. – № 3. – С. 37–41.

5. Гайдукова, Ю. А. Этапы развіцця беларускага народнага сцэнічнага касцюма / Ю. А. Гайдукова // Пытанні мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фалькларыстыкі / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2009. – Вып. 6. – С. 564–570.

**Публікацыі ў часопісах і зборніках**

6. Гайдукова, Ю. А. Прынцыпы сцэнічнай інтэрпрэтацыі беларускага народнага касцюма для эстрадных калектываў / Ю. А. Гайдукова // Запіскі Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі мастацтваў : навук. вучэб.-метад. выд. / Бел. дзярж. акад. мастацтваў ; гал. навук. рэд. Р. Б. Смольскі. – Мінск, 2006. – С. 118–122.

7. Гайдукова, Ю. А. Шляхетныя касцюмы "Песняроў" / Ю. А. Гайдукова // Беларускае мастацтва ў дыялогу культур : зб. навук. арт. / Бел. дзярж. акад. мастацтваў ; склад. і навук. рэд. Н. С. Валанцэвіч. – Мінск, 2009. – С. 141–144.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

8. Гайдукова, Ю. А. Беларускі народны сцэнічны касцюм у канцы 1950-х – 1970-х гг. / Ю. А. Гайдукова // Наука и образование в условиях социально-экономической трансформации общества: материалы XII междунар. науч.-практ. конф., Минск, 18 мая 2009 г. / Институт современных знаний имени А. М. Широкова ; редкол.: В. А. Мищенко [и др.] – Минск, 2009. – С. 145–149.

9. Гайдукова, Ю. А. Влияние глобализации на белорусский сценический костюм в условиях глобализации культуры / Ю.А. Гайдукова // Актуальные проблемы искусства и современной художественной школы

Белоруссии в условиях глобализации культуры : материалы междунар. науч.-теор. конф., Минск, 19 октября 2006 г. / Бел. гос. акад. искусств ; редкол.: Р. Б. Смольский [и др.] – Минск, 2006. – С. 168–171.

10. Гайдукова, Ю. А. Мастацка-стылістычныя асаблівасці розных этапаў развіцця беларускага сцэнічнага касцюма, створанага на аснове народнага / Ю.А. Гайдукова // Наука и образование в условиях социально-экономической трансформации общества: материалы XIII междунар. науч.-практ. конф., Минск, 15 апреля 2010 г. / Институт современных знаний имени А. М. Широкова ; редкол.: В. А. Мищенко [и др.] – Минск, 2010. – С. 254–257.

11. Гайдукова, Ю. А. Пераасэнсаванне традыцый беларускага народнага адзення ў сцэнічным касцюме / Ю. А. Гайдукова // II-я Няфёдаўскія чытанні : матэрыялы міжнар. навук.-творч. канф., Мінск, 24 – 25 красавіка 2005 г. / Бел. дзярж. акад. мастацтваў ; рэдкал.: Р. Б. Смольскі [і інш.] – Мінск, 2005. – С. 110–113.

12. Гайдукова, Ю. А. Принципы сценической интерпретации белорусского народного костюма / Ю. А. Гайдукова // Мода и Дизайн: исторический опыт – новые технологии : материалы 9-й междунар. науч. конф., Санкт-Петербург, 4 – 7 июля 2006 г. / СПб гос. ун-т технологии и дизайна, Рос. этнографический музей ; редкол.: Н. М. Калашникова [и др.] – СПб, 2006. – С. 15–20.

13. Гайдукова, Ю. А. Прынцыпы сцэнічнай інтэрпрэтацыі / Ю. А. Гайдукова // Творчасць. Філасофія. Мастацтва: матэрыялы II-й міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 11 – 12 красавіка 2006 г. / Бел. дзярж. акад. мастацтваў ; рэдкал.: Р. Б. Смольскі [і інш.] – Мінск, 2006. – С. 88–92.

# РЭЗЮМЭ


**Гайдукова Юлія Аляксандраўна**

**Сцэнічнае ўвасабленне беларускага народнага касцюма**
**(другая палова XX – пачатак XXI стагоддзя)**

*Ключавыя словы:* сцэнічная інтэрпрэтацыя, беларускі народны касцюм, стылізацыя, мастацкае праектаванне, мастак-мадэльер, трансфармацыя, кампазіцыйна-вобразная аснова.

*Мэта дысертацыі:* стварэнне сістэмных уяўленняў аб беларускім сцэнічным касцюме, які быў створаны на аснове народнага ў другой палове XX – пачатку XXI ст., і адначасова з'яўляецца часткай комплексу традыцыйнай культуры і аўтарскім творам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

*Метады даследавання.* Асноўным метадам даследавання з'яўляецца сістэмны падыход. Асноўная аналітычная праца праводзілася з дапамогай прынцыпаў фармальна-стылістычнага аналізу. Важнымі метадамі дысертацыйнага даследавання з'яўляюцца метад параўнаўчага аналізу і метад класіфікацыі.

*Навуковыя вынікі і іх навізна.* Прапанаваная праца – першае ў беларускім мастацтвазнаўстве даследаванне сцэнічнага касцюма, створанага на аснове народнага. У працы ўпершыню вызначаны гістарычныя этапы развіцця беларускага сцэнічнага касцюма, дадзена характарыстыка кожнага з этапаў і вызначаны мастацка-стылістычныя асаблівасці касцюмаў, удакладнена класіфікацыя паводле прынцыпаў інтэрпрэтацыі, якія выкарыстоўваюцца мастакамі-мадэльерамі. Значная частка выкарыстаных факталагічных і візуальных матэрыялаў раней не публікавалася і ўводзіцца ў навуковы ўжытак упершыню.

*Рэкамендацыі да выкарыстання.* Матэрыялы і вынікі дысертацыйнага даследавання ўведзены ў шэраг навучальных дысцыплін напрамку спецыяльнасці "Дызайн касцюма і тканін" ВНУ Беларусі. Матэрыялы даследавання з'яўляюцца дапаўненнем метадычнай базы ў навукова-даследчай, выставачнай і асветніцкай дзейнасці музеяў, галерэй і навукова-метадычных цэнтраў Беларусі. Вынікі даследавання маюць навуковую значнасць для стварэння наступных тэарэтычных прац па гісторыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, беларускага касцюма.

*Галіна выкарыстання*: мастацтвазнаўства, дызайн-праектаванне (касцюм), фалькларыстыка, сцэнаграфія.

// РЕЗЮМЕ

**Гайдукова Юлия Александровна**

**Сценическое воплощение белорусского народного костюма (вторая половина XX – начало XXI века)**

*Ключевые слова:* сценическая интерпретация, белорусский народный костюм, стилизация, художественное проектирование, художник-модельер, трансформация, композиционно-образная основа.

*Цель диссертации:* создание системных представлений о белорусском сценическом костюме, созданном на основе народного во второй половине XX – начале XXI века, который одновременно является частью комплекса традиционной культуры и авторским произведением декоративно-прикладного искусства.

*Методы исследования.* Основным методом исследования является системный подход. Основная аналитическая работа велась с помощью формально-стилистического анализа. В ходе исследования были так же использованы метод сравнительного анализа и метод классификации.

*Научные результаты и их новизна.* Предлагаемая работа – первое в белорусском искусствоведении исследование сценического костюма, созданного на основе народного. В работе впервые определены исторические этапы развития белорусского сценического костюма, дана характеристика каждого из этапов и определены художественно-стилистические особенности костюмов, уточнена существующая классификация на основании используемых художниками-модельерами принципов интерпретации. Значительная часть использованных фактологических и визуальных материалов ранее не публиковалась и вводится в научный оборот впервые.

*Рекомендации к использованию.* Материалы. и результаты исследования внедрены в ряд учебных дисциплин направления специальности «Дизайн костюма и тканей» ВУЗ Беларуси. Материалы исследования являются дополнением методической базы в научно-исследовательской, выставочной и исследовательской деятельности музеев, галерей, и научно-методических центров Беларуси. Результаты исследования имеют научную значимость при создании последующих теоретических работ по истории декоративно-прикладного искусства, истории белорусского костюма.

*Область применения:* искусствоведение, дизайн-проектирование (костюм), фольклористика, сценография.

## SUMMARY

**Gajdukova Julia Aleksandrovna**

**Scenic embodiment of the Belarus national suit (second half of XX – beginning of XXI century)**

*Keywords:* scenic interpretation, the Belarus national suit, stylization, art designing, the artist-fashion designer, transformation, a composite-shaped basis.

*The dissertation purpose.* A research purpose is creation of system presentations about Belarusian stage suit, created on the basis of folk in the second half XX – beginning of XXI century, which simultaneously is part of complex of traditional culture and author work of the decorative-applied art.

*Research methods:* the Basic method of research is the system approach. The basic analytical work was conducted by means of the formal-stylistic analysis. During research were as the method of the comparative analysis and a classification method are used.

*Scientific novelty of research.* Offered work – the research of the scenic suit created on the basis of national first in the Belarus art criticism. In work historical stages of development for the first time are defined, the characteristic of each of stages is given and is art-stylistic features of the Belarus national scenic suits are defined, existing classification on the basis of a principle of interpretation used by the artist-fashion designer is specified. The considerable part used-facts and visual materials was not published and introduced earlier in a scientific turn for the first time.

*Recommendations to use.* Research Materials will promote creation of theoretical works on history of arts and crafts, history of the Belarus suit. Materials and research conclusions can be useful during preparation of post-graduate students, students of magistracy and students of educational institutions of Belarus of an art profile. Research materials become methodical base in research, exhibition and educational activity of museums and galleries and the scientifically-methodical centres of Belarus.

*Field of application:* art criticism, design-planning (suit), folkloristiks, scenografiks.